*Таццяна Пладунова*

# МАСТАЦКАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ ЭТНАФОНІІ КУПАЛЛЯ НА СВЯТАХ І ФЕСТЫВАЛЯХ

Беларуская этнафанічная традыцыя адыгрывае вважную ролю ў жыцці нашага народа і сёння запатрабаваная як эстэтычны ідэал і этнаэкалагічны падмурак развіцця аматарскай творчасці. Праблема захавання і засваення этнафанічных традыцый беларусаў зразумелая спецыялістам культурна-адукацыйнай сферы і так ці інакш падштурхоўвае фалькларыстаў-практыкаў, этнапедагогаў, спевакоў-аматараў да пошуку шляхоў і сродкаў па яе вывучэнні і адэкватнай прэзентацыі. Перспектыўным уяўляецца абрадавае свята як найбольш цэласная сістэма поліфункцыянальных па змесце і прызначэнні кодаў, у тым ліку музычна-вербальнага (песні).

Фалькларысты за раннетрадыцыйнай песняй (каляндарнай, ці сямейнага цыклу) зацвердзілі азначэнне «люстэрка абраду», бо песня амаль заўсёды каменціруе абрад і акумуліруе яго міфалагічны змест. Яна дае канву абрадавым дзеянням, канстатуе ўсё, што здзяйсняецца ў абрадзе, або передае яго ў іншасказальнай форме [4, с. 25]. Па выказваннях этнамузыколага, даследчыка рэгіянальных этнафанічных традыцый Беларусі Г. В. Таўлай, менавіта песня апавяшчала ўдзельнікаў абрадавага рытуалу пра тое, што адбываецца. Захоўваючы выпрацаваную стагоддзямі сістэму міфалагічных абрадавых уяўленняў, яна з'яўлялася свайго роду «сцэнарыем» свята. Усё, што здзяйснялася па абрадавай традыцыі альбо прадстаўлялася сродкамі народнай пантамімы і харэаграфіі, знаходзіла адлюстраванне ў песні.

Так, на прыкладзе адпраўлення Купалля ў другасных формах фальклярызму, сіламі аматарскіх фальклорных гуртоў, хочацца давесці некаторыя аспекты вывучэння і засваення яго самабытных праяў.

Не сакрэт, што ў сёння перад намі паўстае праблема знікнення «жывых» абрадаў, і адным з яе рашэнняў з'яўляецца іх мастацкая рэканструкцыя. Адрозненне ад аўтэнтычнага абраду ў тым, што яго выконваюць не носьбіты традыцыі ў натуральным вясковым асяроддзі, а сучасныя фалькларысты-практыкі і аматары народнай творчасці. Распрацоўцы тэарэтычных падыходаў да рэканструкцыі традыцыйных абрадаў, пошуку шляхоў і сродкаў пераймання і адэкватнай прэзентацыі абрадавай этнафоніі, драматургіі свята прысвечана праца кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Ад пачатку стварэння кафедры (2003 год) студэнтамі і выкладчыкамі праводзіцца экспедыцыйна-даследчая фалькларыстычная праца, назапашаны аўдыё- і відэафонд этнафоніі абрадавых і пазаабрадавых практык рэгіёнаў. Фальклорныя запісы з Полаччыны і Глыбоччыны і сёння натхняюць аўтара да постфальклорнай купальскай феерыі, якая штогод адбываецца ці ў ваколіцах Мінска (вёскі Вязынка, Ракаў, Строчыцы) ці на буйным фестывалі фальклорнага мастацта «Берагіня» (г. п. Акцябрскі Гомельскай вобласці) [2, с. 260]. За апошнія гады святкавання сабраны вялікі спеўны рэпертуар, які паслужыў сістэматызацыі рэгіянальных узораў у «Купальскі спеўнік» [3]. У ім змешчаны купальскія песні, гульні і танцы, у розныя гады запісаныя айчыннымі фалькларыстамі Р. Шырмам, Г. Цітовічам, Т. Варфаламеевай, Л. Касцюкавец, У. Раговічам. Большую частку «Спеўніка» складаюць песні са збораў З. Мажэйка (песні беларускага Паазер'я і Палесся) і Г. Таўлай (песні ўсіх рэгіёнаў). Асобнае месца займаюць песні Полацкага Купалля, запісаныя Р. Гамзовіч, В. Калацэем і Т. Пладуновай, большасць з якіх друкуюцца ўпершыню.

Папярэднічаў «Купальскаму спеўніку» рукапісны песенны зборнік, які склала яшчэ ў сярэдзіне 1980-х гадоў мастак і грамадскі дзеяч Валянціна Якімовіч [6, с. 175-181]. Па яе «спеўніку» многія творчыя аб'яднанні, у іх ліку гурты «Дзянніца» і «Госціца», калектывы навучэнцаў Беларускага гуманітарнага ліцэя, супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, развучвалі песні і святкавалі Купалле ў Вязынцы і Строчыцах (праводзіла «спеўкі» В. Якімовіч). Фарміраваўся гэты зборнік з вопыту правядзення постфальклорных Купалляў, арганізаваных грамадскімі аб'яднаннямі «Майстроўня», (музычнай часткай кіравала Л. Сімаковіч, кіраўнік слыннага фальклор-тэатра «Госціца», беларускі кампазітар і харэограф), «Талака» (лідар - гісторык і літаратар С. Вітушка, музычныя кіраўнікі – А. Ткачова і А. Бобер з гурта «Голас»), фальклорнай суполкай г. Заслаўе «Летуценнікі» (лідар – мастак Т. Гаранская, музычны кіраўнік – хормайстар А. Ліпніцкая). Дзякуючы гэтым суполкам і іх яскравым прадстаўнікам, Купалле распачало свой постфальклорны рух у канцы XX стагоддзя і перакінулася ўжо ў XXI ст. – заклікам бубнаў і дудаў, голасам абарадавых спеваў, магіяй агню і вады, гульняў і танцаў, якія ўтварае сёлентняя фальклорная моладзь (фальклорныя гурты «Верас», «Ветах», «Талака», «Гасцінец», «Вянок», «Калыханка», «Кудзьмень», «Гуда», «Княжыч», «Горынь», «Этна-Суполка», «Вяснянка», «Страла», «Раме», інш.).

У «Купальскім спеўніку» ўкладальнік імкнулася адэкватна адлюстраваць этнафанічную партытуру беларускага Купалля і прадставіць уласны творчы падыход у рэчышчы мастацкай рэканструкцыі свята. Так, тэрмін «рэканструкцыя» ў навукова-даследчых працах айчынных фалькларыстаў, метадычных распрацоўках рэжысёраў свят ужываецца як сучасна адаптаванае ўзнаўленне абрадавага дзеяння на рэгіянальнай дакументальнай аснове, ва ўсіх яго асноўных этапах, з захаваннем вербальных, этнафанічных, пластычных і драматычных кампанентаў. Такім чынам, намі вылучаны асноўныя прынцыпы мастацкай рэканструкцыі абраду: дакладнасць увасаблення, вуснасць пераймання ўсіх яго кампанентаў, актуальнасць функцыянальнага зместу абраду ў сацыяльна-культурным і эстэтычным запатрабаванні грамадства.

Вопыт сучасных «купалаванняў» досыць багаты, менавіта ён і паслужыў асновай для выпрацоўкі гэтага падыходу. Задачам абагульніць і асэнсаваць вопыт прысвечана метадычная распрацоўка аўтара

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Абрадавая карта Купалля»[1], якая акумуліруе асноўны змест свята і тэзісна прадстаўляе яго сцэнарый («па гарызанталі» і «па вертыкалі») [3, с. 8-11].

Дадатковага тлумачэння патрабуе раздзел «музычна-вербальны код», у якім сканцэнтраваная ўвага на функцыянальна-тэматычных прыкметах купальскіх песень, але не зафіксаваныя іх этнафанічныя праявы. Вакальная этнафонія абраду прадстаўлена так званымі «тыпавымі напевамі», якія ў народнай свядомасці выступаюць як гукавы сімвал абраду, падкрэсліваючы яго нарматыўна-рэгламентуючую і знакава-апазнавальную ролю ў традыцыйным грамадскім жыцці. Абрадавыя тыпавыя напевы тым ці іншым «голасам» апавяшчаюць пра змену сезоннасці, жыццёвых цыклаў чалавека, яго працоўную актыўнасць. Па даследаваннях Г. Таўлай, гукавы сімвал Купалля прадстаўлены на Беларусі рэгіянальна адметнымі варыянтамі сямі асноўных тыпавых напеваў [4, с. 25]. У адной вёсцы Купалле можа «гучаць» на тры-пяць мелодый – тыпавых напеваў, - яны прадстаўляюць своеасаблівы гукавы пашпарт свята, праходзячы скразнымі промнямі праз усе яго абрадавыя цырымоніі (такім чынам «апяваючы» ўсе акцыянальныя коды свята). За адной мелодыяй (тыпавым напевам) замацавана некалькі песенных тэкстаў, розных па функцыянальным змесце, але агульных па мэтавым абрадавым прызначэнні.

Этнафанічная палітра Купалля на Беларусі досыць разнастайная, і яе праявы залежаць ад функцыі і кантэксту спеваў. Адзін з галоўных крытэрыяў выканальніцтва – гэта гучныя «галасныя» спевы ў акустыцы прыроднага асяроддзя, - якія яскрава дэманструюць экстравертную энэргетыку этнафоніі ўсяго вясновалетняга перыяду. Як адзначае З Мажэйка, менавіта з веснавым «выхадам на волю» («з хаты») сцвярджалася народная школа «галаснога спеву» на адкрытым паветры з яго фанічнымі эфектамі, раскацістым рэхам доўгіх воклічаў, антыфоннымі пераклічкамі спеўных гуртоў. З «выхадам на вуліцу» складвалася таксама народная кінестычна-пластычная школа з майстэрствам ваджэння карагодаў, масавымі шэсцямі-праходамі з канца ў канец вуліцы, уцягваючы ў карагод усё новых удзельнікаў [1, с. 25].

Выканальніцтва купальскіх песень прадстаўлена ў дыяпазоне ад моўнай дэкламацыі і рытуальных воклічаў да рухальнай дынамікі і лірызацыі песенных выказванняў, што абумоўлівае адмысловы характар гуказдабывання і голасавядзення ў іх. Так, у магічна-апавядальных баладах, «апяваннях» вобразу Купалы (Купалінкі) дэкламацыйнасць рэалізуецца ў *рэчытатыўным тыпе голасавядзення*; святочная ўрачыстасць, або заклінальнасць купальскіх «воклічаў» адлюстравана *рэчытатыўна-вакальным і рэчытатыўна-сігнальным тыпамі голасавядзення*; рухальная дынаміка жартоўных і танцавальна-гульнявых песень абумоўлівае *рэчытатыўна-сігнальна-танцавальны тып голасавядзення*; лірычнасць песенных выказванняў (балад, песень да збору зёлак і пускання вянкоў па вадзе, умоўна прымеркаваных твораў) працякае ў *рэчытатыўна-вакальным тыпе голасавядзення.*

Пры складанні рэгіянальнай абрадавай карты, паводле прапанаванага ўзору неабходна ўлічыць гэтыя моманты і зрабіць аўдыё- (нотны) дадатак сістэматызацыі тыпавых напеваў (па прынцыпе: «Напеў 1», «Напеў 2», г.д.) з дапасаванымі да іх песеннымі тэкстамі і этнафанічнымі заўвагамі (пазначэннем тэмбрава-дынамічных, артыкуляцыйных асаблівасцей спеваў, характару (тыпаў) голасавядзення).

На аснове дадзенай абрадавай карты і яе этнафанічнага каментара - «Купальскага спеўніка» - абрадавае свята магчыма адаптаваць пад рэгіянальнае (міжрэгіянальнае), ці агульнанацыянальнае Купалле – шляхам вылучэння асобных абрадавых этапаў і падбору да іх песенных узораў (адпаведна мэце правядзення свята). Паводле гэтых і іншых матэрыялаў студэнтамі спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» ужо былі прадстаўлены шматлікія купальскія этнафанічныя праекты (дыпломныя праекты «Купалле на Віцебскім Падзвінні» студэнтаў этнафанічнай майстэрні Т. А. Пладуновай (2008), «Купалле на Магілёўскім Падняпроўі», «Купалле на Брэсцкім Палессі» (2011) студэнтаў этнафанічнай майстэрні Н. В. Петуховай; «Купальская містэрыя» студэнцкага ансамбля «Талака» на фестывалях «Берагіня» (2008, 2010, 2012), «Сонцаварот» (2013). Праведзеныя святы яшчэ раз сведчаць пра жывучасць і запатрабаванасць грамадствам святкаваць і спяваць разам.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларусы. Т.11. Музыка / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]; рэдкал.: М. Ф. Піліпенка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Кроапівы. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 700 с.: іл.
2. Купалле на “Берагіні”// Берагіня: Пяты Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва (2006 – 2008) /Укл. М.А.Козенка. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2008. – 271 с.
3. Купальскі спеўнік: метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А.Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с. : іл.
4. Тавлай, Г. В. Белорусское купалье: Обряд, песня./ Г. В. Тавлай – Мн.: Наука і техніка, 1986. – 174 с.:іл.
5. Толстой, Н. И., Толстая, С. М. К реконструкции древнеславянской духовной культуры (лингво- и этнографический аспект)//Славянское языкознание / VIIIМеждунар. Съезд славистов, Загреб-Любляна, сент. 1978 г. – М.: наука, 1978. – 469 с., 1 л. карт.
6. Якімовіч В. “А йшлаКупалкасялом.,сялом”. Князь – Купаліш і Купалінка.// Роднае слова – 1998 г. - № 6 .


[1]Абрадавая карта (рэгіянальнага свята) распрацавана Т.А.Пладуновай у рамках вучэбнай дысцыпліны «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці” як метад сістэматызацыі кампанентаў свята (кодаў) на аснове методыкі гістарычнай рэканструкцыі абрадаў расійскіх вучоных М.І і С.М. Толстых [5, с. 370-385].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ